Сядзі і глядзі

# Белтэлерадыёкампанія пакажа канцэрты «Маладзечна-2023»

**Сёлета 9 і 10 чэрвеня пройдзе XXII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». Дзякуючы трансляцыям асноўных канцэртных праграм і аператыўным выпускам навін гледачы тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 3» змогуць пранікнуцца атмасферай форуму і нават пабываць на яго галоўнай канцэртнай пляцоўцы.**



З 9 да 11 чэрвеня «Навіны культуры» на сацыякультурным канале будуць выходзіць у фармаце дзённікаў Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». Карэспандэнты пабываюць на мерапрыемствах музычна-паэтычнага форуму, пагавораць з удзельнікамі і арганізатарамі, пакажуць сюрпрызы, падрыхтаваныя для жыхароў і гасцей горада. А вынікі свята даведаемся ў нядзелю ў праграме «Культурны тыдзень».

Цэнтральнай падзеяй першага дня стане ўрачыстае адкрыццё XXII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023» «Усе зоркі зышліся» на сцэне Летняга амфітэатра. У канцэртнай праграме возьмуць удзел артысты тэлевізійных праектаў «Х-Фактар» і «Фактар.by». Яны выступяць у суправаджэнні Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі імя М. Я. Фінберга». Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор — Максім Расоха. Тэлеверсію канцэрта-адкрыцця фестывалю пакажа канал «Беларусь 1» 9 чэрвеня ў 21.45. На наступны дзень 10 чэрвеня ў 11.30 і 15.30 на «Беларусь 3» глядзіце прамыя трансляцыі II і III тураў рэспубліканскага этапу Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна-2023» са сцэны Палаца культуры.

Завершыцца фестываль гала-канцэртам «Любімыя песні. Спяваем разам» на сцэне Летняга амфітэатра. У праграме возьмуць удзел Анатоль Ярмоленка, Уладзімір Громаў, Ірына Дарафеева, Вікторыя Алешка, Жанэт, Нацыянальны акадэмічны народных хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча і іншыя. У рамках канцэрта пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна-2023». Атрымаць асалоду ад вялікага святочнага канцэрта гледачы тэлеканала «Беларусь 1» змогуць 10 чэрвеня ў 21.50.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 173**

Наш чытач Васіль Жуковіч з Мінска прапанаваў змясціць прыгожую мініяцюру расійскага складальніка Д. Кларка, якая была зроблена ў далёкім 1879 годзе *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Кpd1, Фg4, Лd2, Cg8, Ka6 (5).
**Чорныя:** Кpe5, пe6 (2).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску адбыліся першынствы Беларусі сярод дзяцей да 8 і 10 гадоў. Прызёрамі сталі:

хлопчыкі да 8 гадоў — 1) Кірыл Жук (Гомель); 2) Павел Поўх (Мінск); 3) Ян Муліца (Кобрын);

хлопчыкі да 10 гадоў — 1) Дамір Булгак (Мінск); 2) Леў Сіўко (Гомель); 3) Ціхан Трафімчук (Брэст);

дзяўчынкі да 8 гадоў — 1) Аляксандра Віцюк (Мінск); 2) Ксенія Ластаўка (Мінск); 3) Ульяна Стаброўская (Мінск);

дзяўчынкі да 10 гадоў — 1) Анастасія Севасцянчук (Мінск); 2) Марыя Салюк (Брэст); 3) Аліса Малюш (Гродна).

* * *

У Сочы адбылося 30-е каманднае першынство Расіі (прэм'ер-ліга), дзе выступалі і беларускія зборныя.

У мужчын каманда Беларусі фінішавала на чацвёртым месцы з дзесяці. У чатырох матчах нашы шахматысты перамаглі, тры прайгралі, а два звялі ўнічыю (з першым і другім прызёрамі, адпаведна, зборнай Масквы і маскоўскім СК КПРФ). На шостай дошцы Максім Царук набраў 6 балаў з 9, на сёмай Арцём Стрыбук — 4,5 з 7. На першай дошцы Дзяніс Лазавік завяршыў унічыю ўсе 9 партый. Па 50 працэнтаў магчымых балаў набралі таксама Міхаіл Нікіценка, Вячаслаў Зарубіцкі і Арцём Сіняўскі, горш выступілі Аляксей Аляксандраў і Аляксей Фёдараў.

У жаночым турніры беларуская каманда заняла сёмае месца з 14 (5 перамог, 3 пройгрышы, 1 нічыя). Варвара Палякова набрала 5,5 бала з 9, Ксенія Зелянцова — 6 з 9, Аляксандра Тарасенка — 4 з 7. На рахунку Ксеніі Норман — 50 працэнтаў балаў, горш выступіла Яна Ільюючак.

* * *

У Мінску прайшла ўніверсіяда з удзелам 30 камандаў беларускіх ВНУ. Першыя шэсць месцаў занялі адпаведна Беларускі ўніверсітэт фізічнай культуры, Беларускі эканамічны ўніверсітэт, Белдзяржуніверсітэт, Беларускі ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт і Віцебскі медыцынскі ўніверсітэт.

* * *

Прызавую тройку рэспубліканскага турніру «Белая ладдзя» склалі каманды мінскіх гімназій № 16 і № 6, аршанскай гімназіі № 2.

На дзіцячых спартыўных гульнях гарадоў-герояў у Маскве каманда Брэста заваявала «бронзу» (саступіўшы толькі Маскве і Санкт-Пецярбургу), а шахматысты Мінскай вобласці былі восьмымі.

У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 15-е месца з 580 і 22-е з 449, Сяргей Жыгалка — 4-е з 497.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Kf5! Правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук. М. Кошаль прапануе пераставіць белага каня на g1: атрымліваецца задача-блізня, дзе да мэты вядзе 1. Kh3.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сваё кіно

# СМЕХ, СЛЁЗЫ І ЖЫЦЦЁ

**У праграме перадач на наступным тыдні значыцца шэраг фільмаў, якія сёлета наблізіліся да знакавых юбілейных дат, а значыць, кожны з іх ужо прайшоў выпрабаванне часам, густамі гледачоў і нават самыя розныя закадравыя перыпетыі, каб некалі з'явіцца на свет. Прапаноўваем больш падрабязна спыніцца на некаторых з такіх кінастужак.**

У эфіры тэлеканала «Беларусь 3» убачым, напрыклад, адзін з любімых у аўдыторыі фільмаў, што адносіцца да класікі беларускага кінематографа, — народную камедыю **«Белыя росы»** (1983 г.) ад рэжысёра Ігара Дабралюбава.



Хоць мы і неадноўчы згадвалі гэтую работу, пераглядаць яе — заўсёды сапраўднае задавальненне. Бо фільм — наглядны прыклад таго, як пры ўдалым супадзенні таленту многіх людзей атрымліваецца кіно на дзесяцігоддзі. Таму ніколі нялішне зноў пераглядзець гісторыю, увасобленую на экране выдатнымі акцёрамі (Усевалад Санаеў, Мікалай Карачанцаў, Генадзь Гарбук, Стэфанія Станюта і іншыя), каб паразважаць над уласнымі ўзаемаадносінамі з роднымі, прыслухацца да сябе і спытаць, ці сапраўды я цяпер там, дзе мне добра і ўтульна, і ў рэшце рэшт пайсці за поклічам сэрца, даўняй марай. І калі хочацца адчуць настальгію па нечым няспраўджаным і разам з тым нотку аптымізму ды веру ў здольнасць змяняць любыя абставіны, плануйце прагляд у аўторак 6 чэрвеня.



А вось у чацвер, 8 чэрвеня, на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць прыгодніцкі дэтэктыў **«Чорны прынц»** (1973 г.). Гэты фільм з'явіўся як адказ на вялікі інтарэс аўдыторыі да першай часткі «Вяртанне «Святога Лукі» (1970 г.). Зняў яе таксама рэжысёр Анатоль Баброўскі. Сюжэт працягу прыгод палкоўніка міліцыі Зорына знаёміць нас з гісторыяй разблытвання чарговага злачынства, звязанага з крадзяжом каштоўнага каменя... І хоць мы ўсе помнім або здагадваемся, што зрабіць тое ў яго атрымаецца, паназіраць за гэтымі акалічнасцямі аднолькава варта. Другая частка трылогіі з Усеваладам Санаевым у галоўнай ролі ў свой час у часопісе «Савецкі экран» была ацэнена так: «Фільм займальны, і інтрыга яго дакладная, і дэталі вывераны». Таксама адзначылі, што кінастужка прывабліве «праўдай адлюстравання — праўдай чалавечай, маральнай». Ухвалілі кінакрытыкі і эвалюцыю вобраза галоўнага героя, які, «аказваецца, зусім не пазбаўлены гумару, здольны іранізаваць», і ўвогуле што іграе акцёр Санаеў надзвычай удумліва, асэнсавана і гарманічна існуючы ў прапанаваных сюжэтам абставінах. Працяг кінааповеду выйшаў на экраны пад назвай «Версія палкоўніка Зорына» ў 1978 годзе. Зняў яе на кінастудыі «Масфільм» рэжысёр Андрэй Ладынін. Раім пагляддзець таксама іншыя прыгоды любімага кінагероя.

Тым часам тэлеканал «Расія-Культура» для прагляду ў панядзелак, 5 чэрвеня, прапаноўвае мастацкі фільм **«І жыццё, і слёзы, і любоў»**, які з'явіўся на «Масфільме» ў 1983 годзе. Кінаработа рэжысёра Мікалая Губенкі паглыбляе гледача ў аповед пра жыццё пастаяльцаў аднаго з дамоў ветэранаў, калі туды прыязджае новы галоўны ўрач Варвара Дзмітрыеўна (ролю выконвае Жанна Болатава). Паказваючы быццам бы звычайныя бытавыя эпізоды, стваральнікі стужкі нагадваюць кожнаму пра важнае ды вечнае: павагу, спагаду да тых, хто побач, любоў да сваёй справы і ўсведамленне, што вярнуць жаданне жыць здольныя неабыякавыя людзі... Не прапусціце глыбокі, кранальны кінааповед у панядзелак днём.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


## Лета ў радасць са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 ліпеня 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем набораў садовага інструмента WMC Tools TG 1001001 і суперпрыз — камплект садовай мэблі Sandays LUC-TA21. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 29 ліпеня 2023 года.



Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або на II паўгоддзе 2023 года. Пасля 30 верасня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 101 ад 30 мая 2023 года.



**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4317 ад 12.05.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2023 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
*(аддзяленне сувязі)*

______ на III квартал або II паўгоддзе 2023 года

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [______] *(індэкс)* ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!